**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

Праспект Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск

тэл. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
E-mail: ministerstvo@kultura.by

**МИНИСТЕРСТВО КУЛЬТУРЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

Проспект Победителей, 11, 220004, г. Минск

тел. (017) 203 75 74, факс (017) 203 90 45
E-mail: ministerstvo@kultura.by

17.04.2017 № 01-19/к-252
На № ________ 01-19/к-253

(для інфармавання
іншых заяўнікоў)

Аб разглядзе звароту

Разгледзеўшы калектыўны зварот адносна бел-чырвона-белага сцяга, паведамляем наступнае.

Пытанні, звязанныя з наданнем статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці рэгулююцца заканадаўствам аб культуры і міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

Прапановы аб наданні бел-чырвона-беламу сцягу статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці неаднаразова разглядаліся Міністэрствам культуры ў 2008, 2013, 2014, 2016 гадах. У сувязі з неадпаведнасцю матэрыялаў па аб'екце нормам заканадаўства, адсутнасцю дастатковай аргументаванасці і дакументальнай абгрунтаванасці, унесеныя прапановы не былі падтрыманы.

Патрабаванні да парадку ўнясення прапаноў аб наданні культурным каштоўнасцям статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці ўстаноўлены артыкулам 90 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры (далей – Кодэкс), згодна з якім да прапановы аб наданні культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці дадаюцца:

матэрыялы фіксацыі, навуковай апрацоўкі і мастацкай ацэнкі культурнай каштоўнасці;

абгрунтаванне неабходнасці надання культурнай каштоўнасці статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці.

У дадзеным калектыўным звароце адпаведныя матэрыялы, вызначаныя артыкулам 90 Кодэкса, адсутнічаюць.

На падставе палажэнняў пункта 10 артыкула 93 Кодэкса прапанова аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці, якая не адпавядае патрабаванням, прадугледжаным артыкулам 90 гэтага Кодэкса, Міністэрствам культуры не можа быць разгледжана.

Дзяржаўнай установай "Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь" 22.01.2017 прынята рашэнне аб неабходнасці ўдасканалення экспазіцыі Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці, якое плануецца завяршыць у IV квартале 2017 года.

Уключэнне ў экспазіцыю Музея сучаснай беларускай дзяржаўнасці бел-чырвона-белага сцяга будзе разгледжана пасля завяршэння працы над тэхнічным заданнем і правядзеннем тэндару па абнаўленні дадзенай экспазіцыі.

Дадзены адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, устаноўленым часткаю першай пункта 1 артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь «Об обращениях граждан и юридических лиц».

Намеснік Міністра А.А.Яцко

11 Ходар 209 47 83